чага і літаратуразнаўчага цыклаў адчуваецца і пры чытанні курсаў "Бібліяграфія мастацтва" і "Бібліяграфія мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства". Малаверагодна, што гэта можна ліквідаваць у працэсе вытворчай практыкі.

У выніку вытворчай практыкі студэнт нашага факультэта шліфуе пазнавальныя, камунікатыўныя, прадметна-практычныя бакі сваёй прафесійнай дзейнасці.

**А.І.Сцепанцоў,**
**прарэктар Беларускага інстытута праблем культуры**

## ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СІСТЭМЕ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ

Мастацкая адукацыя з'яўляецца часткай агульнай сістэмы адукацыі краіны. У агульнаадукацыйнай школе прадметы мастацкага цыкла з'яўляюцца арганічнай часткай праграмы і садзейнічаюць гарманізацыі вучэбнага працэсу. Дадаткова дзеці могуць наведваць дзіцячыя школы мастацтваў, якія даюць паглыбленыя веды па розных відах мастацтваў, рыхтуюць да паступлення ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы мастацтваў. Музычныя, мастацкія, харэаграфічныя каледжы, вучылішчы — асноўнае звяно прафесійнай адукацыі спецыялістаў мастацтва і культуры. Яны рыхтуюць моладзь для практычнай дзейнасці ў сферы культуры, а таксама для працягу навучання ў вышэйшых навучальных установах мастацтва і культуры. На вышэйшым узроўні адукацыі адбываецца пэўнае авалодванне комплексам ведаў, уменняў і навыкаў, дастатковых для самастойнай практычнай дзейнасці ў мастацтве, выпускнік актыўна праяўляе сябе як творчая асоба.

Змест мастацкай адукацыі вынікае з сутнасці мастацтва і вызначаецца пэўнымі яго відамі. Мастацтва фарміруе душэўны і эмацыянальны свет чалавека, аказвае значны ўплыў на яго праз яркую вобразнасць і метафарычнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў. Пачуццёва-эмацыянальнае ўспрыманне, перажыванне і суперажыванне характэрныя пры спасціжэнні мастацкіх вобразаў. Мэта мастацкай адукацыі — раскрыццё і развіццё мастацкіх здольнасцей, выхаванне вобразнага мыслення, творчай фантазіі дзяцей, падлеткаў, моладзі, а таксама набыццё імі спецыяльных уменняў, навыкаў, майстэрства, ведаў.

Эзатэрычнасць мастацкай мовы выключае магчымасць замены творчага працэсу паняційнымі ведамі. Засваенне мастацтва магчымае толькі праз творчасць, г.зн. духоўна-практычную дзейнасць. Умоўна мастацкую творчасць можна падзяліць на дзве сферы: першасную, творчасць (стварэнне твора мастацтва), і выкананне (іграваое ўзнаўленне твора мастацтва). Чым больш практыкі ў тым ці іншым відзе мастацтва, тым глыбей спасціжэнне мастацтва. Заканамерна, што важнейшай формай мастацкага вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляецца ўрок у класе па спецыяльнасці — практычная дзейнасць вучня, студэнта пад кіраўніцтвам настаўніка, прафесара. Гэтая асабістая, жывая, непасрэдная практыка — увасабленне твора мастацтва, адпрацоўка яго асобных элементаў. Яна падмацоўваецца самастойнымі заняткамі, якія па сутнасці з'яўляюцца такой жа практыкай па засваенні твора мастацтва, па ўдасканаленню ўменняў, навыкаў, паглыбленні ведаў.

Такім чынам, спецыяльны клас — асноватворны від практыкі ва ўсёй сістэме мастацкай адукацыі. Ён падмацоўваецца канцэртнай (для музыкантаў), сцэнічнай (для тэатралаў), пленэрнай ці выставачнай (для мастакоў), іншымі формамі практыкі, скіраванымі на кантакты з публікай. Спецыяльны клас — гэта прафесійная "школа", якая мае даўнія гістарычныя вытокі і вядома як школа-майстэрня.

Вытокі прафесійнасці звязаны з раздзяленнем працы і вядомыя яшчэ з часоў першабытна-абшчыннага строю. Пераход з дзяцінства ў даросласць вызначаўся выпрабаваннем, якому папярэднічала спецыяльная падрыхтоўка ў працоўных, воінскіх і рытуальных дзеяннях, якія ўключалі спевы, танец і ігру на музычных інструментах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выдатным прыкладам школ-майстэрань з'яўляецца дзейнасць рамеснікаў, якія працавалі ў гарадах і пры княжацкіх дварах і спецыялізаваліся па асобных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Майстар перадаваў сваім вучням уласны вопыт стварэння мастацкіх вырабаў, спрыяў выпрацоўцы ў юнакоў працоўных прафесійных навыкаў і тэхнічных прыёмаў апрацоўкі розных матэрыялаў (металу, скуры, тканіны, дрэва і г.д.). Вопыт назапашваўся стагоддзямі, перадаваўся з пакалення ў пакаленне.

У XVI ст. узнікаюць прафесійныя аб'яднанні — цэхі, у якіх канцэнтравалася асноўная частка рамеснікаў. Майстар, які жадаў уступіць у цэх, павінен быў здаваць экзамен па дадзенай спецыяльнасці.

У XVII — XVIII стст. шырока развіваюцца мануфактуры мастацкіх вырабаў пры манастырах і маёнтках, якія рыхтавалі ўласных майстроў з ліку жыхароў прылеглых мясцовасцей. Майстар-настаўнік з'яўляўся адзіным уладальнікам сапраўдных сакрэтаў прафесіі, якія перадаваліся толькі ў працэсе навучання.

Аналагічная сутнасць старажытных музычных школ-майстэрань. У антычнай Грэцыі гэта школы кіфарэдаў, аўледаў. У сярэднявеччы (XV — XVI ст.) у еўрапейскіх арганізацыях прафесійнай музычнай адукацыі ўсталявалася школа універсальнага музычнага майстэрства. Іх лідэры валодалі комплексам асноўных відаў музычнай дзейнасці, якая ўключала сачыненне і выкананне музыкі, аналіз і імправізацыю, распрацоўку методык навучання і крытычную ацэнку.

На Беларусі прафесійныя музычныя школы вядомы з XVIII ст. Яны існавалі пры прыдворных аркестрах і рыхтавалі для іх музыкантаў.

На аснове непасрэднай перадачы сакрэтаў прафесіі ад майстра да вучня пабудавана і навучанне харэаграфіі, якое таксама мае даўнія гістарычныя вытокі, як і майстэрства акцёра, якое таксама магчыма перадаць "з вуснаў у вусны, ад сэрца да сэрца". Першыя балетныя школы ўзніклі на Беларусі ў XVIII ст. і рыхтавалі танцоўшчыкаў для пастановак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

балетаў на сцэнах прыватных тэатраў, якія існавалі ў Слуцку, Нясвіжы, Слоніме, Шклове, Гродне. Так, выпускнік Гродзенскай школы Тызенгаўза Міхал Рымінскі стаў салістам балета ў Варшаве і Львове, а выпускнікі Шклоўскай школы Пелагея і Кацярына Азарэвічі, Красцьян Буткевіч былі запрошаны і танцавалі на сцэне Пецярбургскага імператарскага тэатра. Вядома, што ў гэтых школах асновай навучання было практычнае засваенне спецыяльных навыкаў: авалодванне пластычнымі рухамі і асноўнымі правіламі класічнага танца.

"Адносіны настаўніка і вучняў — гэта тое ядро, з чаго развіваецца "арганізм" культурнай традыцыі. Школа-майстэрня ўпарадкоўвае гэтыя адносіны, стварае ўмовы, якія дазваляюць зрабіць выдатныя дасягненні майстра рэальнымі для многіх паслядоўнікаў, а дасягненні школы — здабыткам прафесійнай традыцыі ў цэлым. Такія ўмовы характарызуюцца сплавам прафесійнага навучання з сумеснай жыццядзейнасцю. Гэтаму спрыяла іерархічная сістэма адносін паміж майстрам, чаляднікамі і малодшымі вучнямі, вытокі якой — у сямейна-радавых устоях арганізацыі сярэдневяковых прафесійных аб'яднанняў (В.Фамін. Школа-майстэрня як феномен культуры).

Сутнасць мастацтва патрабавала зліцца дзейнасці майстра-настаўніка і яго вучняў і праяў гэтай дзейнасці на практыцы. У мастакоў зачастую чаляднікі падрыхтоўвалі аснову карціны ці скульптуры, а майстар у заключэнне наносіў вызначальныя штрыхі.

Сатворчасцю прасякнуты ўзаемаадносіны настаўніка-харэографа і вучняў-танцораў. Навучанне найбольш эфектыўнае ў практычным увасабленні рухаў на ўроках. Настаўнік-рэжысёр перадае юным акцёрам сакрэты драматычнага мастацтва ва ўмовах, максімальна набліжаных да сцэны (практыкі).

Да нашага часу захаваліся традыцыі музычнай школы-майстэрні, якія існуюць у асобных звёнах навучання дзіцячай музычнай школы, музычнага вучылішча, музычнай ВНУ.

Школа-майстэрня ў сучаснасці, як гэта было і здаўна, —

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

школа практычнага засваення мастацтва. Яна характарызуецца глыбокай духоўнай сувяззю майстра-настаўніка і вучняў, якія разам адкрываюць спецыфічны свет мастацтва, шукаюць шляхі авалодання прафесійным майстэрствам. Найбольш адпавядае гэтым мэтам сістэма навучання ў Беларускім універсітэце культуры, Беларускай акадэміі музыкі і Беларускай акадэміі мастацтваў. Гэта буйныя культурна-асветніцкія цэнтры краіны, у якіх шырока ажыццяўляецца канцэртная, выставачная, тэатральная дзейнасць. Вядомасць за межамі краіны набылі студэнцкія сімфанічны, камерны, духавы аркестры, хор Беларускай акадэміі музыкі; фальклорныя ансамблі "Валачобнікі" і "Грамніцы", джазавыя, эстрадныя, бальныя ансамблі Беларускага універсітэта культуры; студэнцкі тэатр Беларускай акадэміі мастацтваў. Удзел студэнтаў у творчых калектывах вышэйшых навучальных устаноў, іх сольныя выступленні, стварэнне аўтарскіх работ — гэта мастацкая практыка, якая завяршае вучэбны працэс.

Практычная скіраванасць навучальнага працэсу з ранняга дзяцінства ажыццяўляецца ў Рэспубліканскім вучэбным комплексе гімназія-каледж пры Беларускай акадэміі музыкі. Гэты вучэбны комплекс пачаў работу як аддзяленне кансерваторыі для адораных дзяцей у 1935 г. З 1947 г. на базе гэтага аддзялення створана сярэдняя спецыяльная музычная школа. Цяпер у навучальнай установе 440 вучняў амаль з усіх абласцей рэспублікі. Гэтая ўстанова — унікальны вучэбны комплекс па раннім выяўленні і прыцягненні да вучобы найбольш адораных дзяцей, укараненні раннеўзроставай сістэмы музычнага развіцця і прафесійнага навучання з элементамі вышэйшага выканальніцкага майстэрства. У аснове навучання дзяцей — развіццё прыродных задаткаў, стымуляванне творчай фантазіі і далучэнне ўжо з першых класаў да канцэртных выступленняў. Комплекс складаюць тры блокі, тры ўзыходзячых узроўні (ступені): ранні (дзіцячы) узровень прафесійнай арыентацыі (6 — 10 гадоў); падлеткавы (набыццё асноў прафесіі, 11 — 15 гадоў); юнацкі ўзровень — асноўная прафесійная ступень, на якой непас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэдная творчая дзейнасць становіцца сэнсам жыцця, актыўна ідзе засваенне вышэйшага выканальніцкага майстэрства(16 — 18 гадоў). Залік практыкі — выпускны экзамен па спецыяльнасці на сцэне філармоніі з праграмай, якая можа скласці гонар і выпускніку акадэміі музыкі. Заканамерна, што выпускнікі вучэбнага комплексу паказваюць высокі ўзровень адукацыі ў Беларускай акадэміі музыкі. Ужо з падлеткавага ўзросту вучань трапляе ў клас прафесара акадэміі, і з гэтага часу яго творчы лёс непарыўна звязаны з асобай выдатнага майстра, такога як, напрыклад, славутыя прафесары заслужаныя дзеячы мастацтваў В. Л. Рахленка і Л. С. Шаламенцава.

З 1945 г. працуе Беларускае дзяржаўнае харэаграфічнае вучылішча(цяпер — каледж), якое скіравана на падрыхтоўку танцоўшчыкаў для прафесійнага харэаграфічнага мастацтва з дванаццацігадовага ўзросту. Аснова заняткаў — танец. Яму ўдзяляецца штодзень не менш чатырох гадзін. Менавіта ў практычным засваенні танцавальных элементаў адбываецца станаўленне будучага артыста балета. Вучылішча выхавала цэлае сузор'е выдатных майстроў сцэны, многія з якіх пасля завяршэння выступленняў у тэатры прыйшлі выкладаць юным танцоўшчыкам. Сакрэты прафесіі перадаюць выдатныя майстры народныя артысты І.А. Савельева, К. М. Малышава, Ю. А. Траян, У.Т. Камкоў, У.У.Іваноў.

Прафесійных мастакоў з юнага ўзросту рыхтуюць у Беларускім рэспубліканскім вучэбным комлексе гімназія-каледж імя І.О.Ахрэмчыка. Як і ў старажытных школах-майстэрнях, тут майстар-настаўнік непасрэдна перадае сакрэты творчасці сваім вучням.

З ранняга дзяцінства ажыццяўляецца навучанне ў Магілёўскім вучэбным комплексе гімназія-каледж музыкі і харэаграфіі. Ранняе практычнае засваенне прафесійных навыкаў у мастацтве дае магчымасць для паспяховых выступленняў на сцэне, для далейшага навучання ў вышэйшых навучальных установах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінскае і Гомельскае вучылішчы, вучылішчы культуры і мастацтваў, музычныя вучылішчы скіраваны на развіццё мастацкіх здольнасцей навучэнцаў, стварэнне ўмоў для набыцця спецыяльных уменняў, навыкаў, майстэрства, ведаў у адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй у мастацтве.

Навучальныя планы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў у значнай ступені скіраваны на практычнае засваенне прафесій. Напрыклад, па спецыяльнасці "інструментальнае выканальніцтва" (духавыя інструменты) з агульнай колькасці 5003 гадзіны на спецыяльную (прафесійную) падрыхтоўку адведзена 4000 гадзін практычных заняткаў — пераважная большасць. З іх чвэрць (1050 гадзін) — на індывідуальныя заняткі. Па спецыяльнасці "дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" з агульнай колькасці 4680 гадзін на спецыяльную (прафесійную) падрыхтоўку адведзена 3227 гадзін практычных заняткаў.

Такім чынам, прафесійнае навучанне ў мастацтве ажыццяўляецца праз практычную мастацкую дзейнасць вучня ў час урока і потым завяршаецца непасрэдна выхадам да публікі.

**В.М.Ушакова,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры,**
**Р.Ф.Шаура,**
**прафесар Беларускага універсітэта культуры**

## НА ШЛЯХУ ДА ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА

Палажэнне аб педагагічнай практыцы студэнтаў непедагагічных ВНУ, якое праходзіць апрабацыю ў вучэбным працэсе Беларускага універсітэта культуры, адлюстроўвае агульныя патрабаванні да яе арганізацыі і правядзення як аднаго з важных этапаў ажыццяўлення навучальнага працэсу ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вышэйшай школы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ